**УДК 141.319**

# АСЭНСАВАННЕ АНТАЛАГІЧНАГА АРГУМЕНТА Ў ТВОРЧАСЦІ І. ВІЛЬКІНОВІЧА

***канд. філос. навук, дац. Г.І. КЛІМОВІЧ***
***(Белорусскій дзяржаўны медіцінскій універсітет, Мінск)***

*Праблема анталагічнай аргументацыі прадстаўляецца адной з асноватворных для схаластычнай рэфлексіі і застаецца актуальнай на ўсім працягу яе развіцця, яна займае важнае месца і ў беларускай філасофска-рэлігійнай думцы. У артыкуле зроблена спроба асэнсавання спецыфікі выкарыстання анталагічнай аргументацыі ў творчасці прадстаўніка т.зв. "барочнай схаластыкі" І. Вількіновіча ў працы "Тэалагічны трактат пра божае адзінства і траічнасць" (Tractatus theologicus de deo uno & trino: olim scholastica cura in usus discipulorum privatos elaborates). Вызначаецца спецыфіка выкарыстання І. Вількіновічам катэгорый фізічная і метафізічная існасць Бога, разглядаюцца асноўныя атрыбуты існасці Бога, вызначаецца пазіцыя аўтара ў адносінах да класічных форм анталагічнай аргументацыі, прадстаўленых у філасофскай спадчыне Ансельма Кентэрберыйскага і Дэкарта.*

***Ключавыя словы:*** *неасхаластыка, анталагічная аргументацыя, сама-відавочныя суджэнні, метафізічная і фізічная існасць Бога, пазнанне Бога апрыёры.*

**Уводзіны.** Нягледзячы на шматвектарнасць тэм і падыходаў у праблемным полі сучаснай гісторыі філасофіі, трэба адзначыць, што толькі ў апошняе дзесяцігоддзе даследчыкі заходнееўрапейскай традыцыі звярнулі ўвагу на феномен так званага "доўгага схаластычнага веку" [7, с. 187], які аб'ядноўвае комплекс мноства канкуруючых традыцый, вядомых пад назвамі "другой схаластыкі", "пост-сярэднявечнай схаластыкі", "схаластыкі ранняга мадэрну", "барочнай схаластыкі", "акадэмічнай філасофіі і тэалогіі". Неасхаластычны кірунак як самабытны культурны феномен яскрава прадстаўлены і ў інтэлектуальнай спадчыне Беларусі. У сучаснасці гэта з'ява добра даследавана ў межах непасрэдна гістарычных работ, але праблематыка, якая з'яўляецца прадметам гісторыі філасофіі, дагэтуль патрабуе далейшых высілкаў у дадзеным напрамку. Цэнтральнымі мысліцелямі, якія выбудоўвалі каноны неасхаластычнай парадыгмы ў беларускай гісторыка-культурнай прасторы, з'яўляюцца Джузэпэ Анджыяліні, Ян Бенеслаўскі, Вінцэнцій Бучынскі, Ігнацій Вількіновіч, Бенедзікт Дабшэвіч, Францішак Дзеружынскі, Ігнацій Жаба, Ян Філіп Рутан, Францішак Ксаверы Чарноцкі і г.д. У працэсе даследавання дадзенай традыцыі з гістарычнага небыцця паўстаюць новыя імёны і забытыя гіганты схаластычнай філасофіі, выпрацаваныя імі ідэі ў суме складаюць непаўторны ландшафт беларускай філасофіі гэтага часу. Адна з такіх постацяў – Ігнацій Вількіновіч (Ignatius Wilkinowicz), які займаў пасаду рэктара Пінскага езуіцкага калегіўма з 1724 па 1727 гг. [6, с. 136]. Метафізічныя погляды аўтара, прадстаўленыя ў схаластычным ключы, знайшлі адлюстраванне ў творы "Тэалагічны трактат пра божае адзінства і траічнасць" (Tractatus theologicus de deo uno & trino: olim scholastica cura in usus discipulorum privatos elaborates), выдадзеным у 1739 г. у Вільні [9, с. 224]. Дыспут 1 дадзенага трактата – "А фізічнай і метафізічнай існасці Бога" закранае класічную для схаластычнай сістэмы філасофіі праблему суаднесення анталагічнай аргументацыі і сама-відавочных суджэнняў.

Праблема анталагічнай аргументацыі ў творчасці беларускіх аўтараў з'яўляецца адным з элементаў неасхаластычнага комплекса ідэй, недаследаваных дастаткова, з вышэйпазначанага вынікае мэта дадзенага артыкула – асэнсаванне спецыфікі рэцэпцыі анталагічнага доказу існавання Абсалюту ў творчасці І. Вількіновіча, што, у сваю чаргу, дазволіць паступова паўнавартасна рэканструяваць асноўныя працэсы засваення неасхаластычных установак у беларускай філасофскай думцы.

**Асноўная частка**. Анталагічны (ансельмаў, картэзіянскі) доказ існавання Бога – адна з найбольш запатрабаваных тэм хрысціянскай філасофіі, першапачаткова сфармулявана ў рэфлексіі Ансельма Кентэрберыйскага наступным чынам: паняцце Бога азначае тое, болей за што мы памысліць не можам, тое, што існуе, знаходзіцца вышэй за тое, што не існуе, такім чынам, Бог неабходна валодае існаваннем. Таксама трэба адзначыць, што падставай анталагічнага доказу з'яўляецца прынцып тоеснасці быцця і мыслення. Анталагічная аргументацыя адносіцца да так званага апрыёрнага тыпу доказаў існавання Абсалюту.

Праблема існавання Абсалюту з'яўляецца аднолькава важнай як для тэалогіі, так і для філасофіі на ўсім працягу яе існавання, знаходзячы адлюстраванне ў дыскурсах як заходне- так і усходнееўрапейскага кірункаў філасофіі. Маючы багатую і разнастайную гісторыю аргументацыі, яна не губляе актуальнасці і ў сучаснасці. У якасці адной з такіх спецыфічных мадыфікацый можна, напрыклад, узгадаць ідэі знакамітага аўстрыйскага логіка – Курта Гёдэля, дадзеная праблематыка таксама з'явілася творчым імпульсам да работ аднаго з найбольш вядомых філосафаў XX ст. – Сямёна Франка, выклікала яна пэўную цікавасць і з боку Карла Барта.

У звароце менавіта да анталагічнага доказу можна вылучыць дзве асноўных вяршыні яго папулярнасці: першая – звязана з пераходам у межах сярэднявечнай філасофіі ад патрыстыкі з яе першынствам credo да схаластычнага ratio, калі дадзеная ўстаноўка апынулася пад прыцэлам жорсткай крытыкі з боку галоўнага аўтарытэта схаластаў – Фамы Аквінскага, і другая, гістарычна звязаная з надыходам ідэй Новага часу.

Актуальнасць анталагічнага доказу існавання Абсалюту ў Новы час звязана ў першую чаргу з актуалізацыяй парадыгмы, якая асэнсоўвала філасофію ў якасці ўніверсальнага мысліцельнага канцінууму, класічныя тэалагічныя праблемы разглядаліся ў гэты перыяд таксама ў якасці філасофскіх.

У дадзены час анталагічны доказ існаваў у двух асноватворных варыянтах – Св. Ансельма Кентэрберыйскага і Дэкарта. Таксама ў перыяд Новага часу варыяцыі анталагічнай аргументацыі прадстаўлены ў творах Мальбранша, Лейбніца і Х. Вольфа. Доказ Св. Ансельма пабудаваны на класічнай іерархіі быцця ў схаластыцы, дзе Бог разглядаецца як сукупнасць дасканаласцяў, вышэй за якую ўжо нічога не існуе, паколькі ідэя Абсалюта існуе ў розуму чалавека, відавочна, што Бог існуе (паколькі мы не можам уявіць нічога, што б не існавала ў рэчаіснасці), і існуе ён неабходна. Важным элементам развіцця анталагічнай аргументацыі стала крытыка з боку Канта, які, як вядома, адзначаў, што існаванне не з'яўляецца прэдыкатам [1, с. 362].

Дэкарт падтрымлівае канцэпцыю Ансельма Кентэрберыйскага, разглядаючы ідэю Бога як ясную і дакладную, існаванне Бога выводзіцца з ідэі аб існаванні вышэйшай існасці. У сучаснаці прысутнічае пазіцыя, згодна якой доказ Ансельма і Дэкарта з'яўляюцца варыяцыямі адной ідэі [3, с. 8]. Таксама трэба дадаць, што ў філасофіі Новага часу прадстаўлены тры варыянты анталагічнай аргументацыі – праз знаходжанне існавання ў самім паняцці Абсалюту, праз дэманстрацыю таго, што Бог можа быць прычынай існавання чалавека і таму існуе вечна, праз абгрунтаванне таго, што ў ідэі Бога пазнанне мае справу з самім Богам [3, с. 8].

Разглядаемая праблематыка ў творах Ігнацыя Вількіновіча прадстаўлена на старонках работы “Тэалагічны трактат пра божае адзінства і траічнасць” (1739) у дыспуце 1 пад назвай “А фізічнай і метафізічнай існасці Бога”, даследаванне 1 – “А фізічнай існасці Бога”, якое складаецца з наступных параграфаў: § 1 “Некаторыя папярэднія нататкі аб вызначэнні фізічнай існасці Бога”, § 2 “З чаго складаецца фізічная існасць Бога”, даследаванне 2 “А метафізічнай існасці Бога”, якое складаецца з § 1 “Папярэднія нататкі”, § 2 “Ці сапраўды метафізічная існасць Бога ёсць першасна быццём ад самаго сябе”, § 3 “Што не ўваходзіць у метафізічную існасць Бога”, § 4 “Ці можа існаванне Бога быць даказана апрыёры” [10, с. 1–24]. Непасрэдна анталагічны аргумент закранаецца ў чацвёртым параграфе, але для разумення пытання неабходны зварот да папярэдніх частак. Па сутнасці рэфлексія ў дадзеным дыспуце І. Вількіновіча з'яўляецца пошукам адказаў на два асноватворных пытанні: 1) ці існуе Бог неабходна, 2) калі існуе, ці магчыма яго пазнанне апрыёры.

У другім даследаванні дадзенага дыспуту – “А метафізічнай існасці Бога” аўтар разглядае традыцыйную для дадзенага аспекту праблематыку – статус паняцця і магчымасць яго рэальнага існавання. Логіка рэфлексіі пабудавана наступным чынам: аўтар ідзе ад разгляду пытання сутнасці Абсалюта і належных яму дасканаласцяў у напрамку праблематызацыі пытання ўвогуле наяўнасці магчымасці і стратэгій пазнання Бога апрыёры.

Рэфлексуючы над праблемай дасканаласцяў Бога, І. Вількіновіч застаецца ў традыцыйным для схаластаў рэчышчы, сцвярджаючы, што Бог ёсць найвышэйшая ступень дасканаласці, у разважаннях абапіраецца на канцэпцыю Ансельма Кентэрберыйскага, які падзяляе дасканаласці на простыя і вытворныя, апошнія не маюць найвышэйшай дасканаласці ў саміх сябе і атрамліваюць яе толькі ад Асбалюту [10, с. 2]. Такім чыным, Абсалют валодае простымі дасканаласцямі (simpliciter simlplices) і з'яўляецца крыніцай вытворных. Простыя дасканаласці не з'яўляюцца створанымі і маюць у сваім змесце ўсю паўнату дасканаласці.

Існасць Абсалюту паводле Вількіновіча падзяляецца на фізічную і метафізічную [10, с. 3, с. 6]. Фізічная існасць рэчы, паводле І. Вількіновіча, ёсць тое, што дадзеную рэч ідэнтыфікуе [10, с. 3], метафізічная існасць рэчы – тое, што з'яўляецца падставай яе быцця і тое, што яе адрознівае ад іншых [10, с. 6]. Фізічная існасць Абсалюту прадстаўляе сабой сукупнасць усіх абсалютных і адносных дасканаласцяў [10, с. 3]. Трэба адзначыць, што дадзены падзел з'яўляецца традыцыйным прынцыпам, характэрным для эпохі Позняй схаластыкі. Згодна з яе асноўнымі рысамі, фізічная існасць бога ахоплівае яго быццё ў якасці субстанцыі, якое адначасова субсідзіруе іншыя віды быцця, а таксама прадстаўляе сабой сукупнасць дасканаласцяў, якія адначасова з'яўляюцца яго ўласцівасцямі, або яго атрыбутамі [2, с. 226]. Такім чынам, Абсалют як фізічная сутнасць разглядаецца як вычарпальная, але адначасова бясконцая паўната. Метафізічная існасць Абсалюту разумеецца як самаіснае існаванне, якое адначасова разглядаецца як крыніца субсідзіравання [2, с. 225].

Найбольш поўна метафізічная сутнасць Абсалюту адлюстравана ў лацінскім выразе – ipsum esse subsistens – тое, што існуе самастойна, маючы прычыну і крыніцу існавання ў сябе самім. Аўтар падзяляе

агульнае для схаластычнай традыцыі палажэнне, згодна з якім Абсалют атрымлівае існаванне ад самога сябе і не патрабуе аніякай знешняй прычыны для свайго існавання [10, с. 8], у адрозненне ад створаных рэчаў, якія заўсёды існуюць ab alio. Вышэйпазначаная ўласцівасць існавання ад самога сябе і з'яўляецца метафізічнай існасцю Абсалюта. У якасці прэдыкатаў аўтарам пазначаюцца наступныя катэгорыі: субстанцыя, жыццё, здольнасць пазнання і волевыяўлення, якія маюць крыніцай яго самасць (Aseitas) [10, с. 13]. Дадзеныя атрыбуты не супадаюць з канцэпцыяй Фр. Суарэса, які ў "Матафізічных разважаннях" дае зусім іншы спіс атрыбутаў быцця: адзінае, ісціннае і добрае [4, с. 409].

Класіфікацыя ступеняў быцця ў творчасці Вількіновіча выглядае наступным чынам: першым ідзе быццё супертрансцэндэнтальнае [10, с. 7], якое ўтрымлівае ў сабе быццё, што існуе, не існуе і не з'яўляецца магчымым. Звычайна, каментуючы неасхаластычныя ідэі Новага часу, даследчыкі адзначаюць уплыў ідэй Суарэса і Вольфа, але ў сістэме метафізічных поглядаў Вількіновіча дадзеная тэндэнцыя не прасочваецца. Даследчыкі адзначаюць, што Суарэс свядома адмаўляецца ад паняцця "супертрансцэндэнтальны" [5, с. 299]. І. Вількіновіч, наадварот, уключае ў аб'ект метафізікі быццё, немагчымае для існавання. Другая ступень – быццё трансцэндэнтальнае, якое з'яўляецца па сутнасці быццём намінальным, а таксама рэальным быццём [10, с. 7]. Трэці від быцця – рэальны. Тэндэнцыя траічнай класіфікацыі быцця ўласцівая для прадстаўнікоў познесярэднявечнага скацізму [5, с. 299], была дастаткова распаўсюджанай у неасхаластычных сістэмах XVIII ст. У якасці прыкладу можна прывесці работу Ансельма Хёрмасэндэра – аднаго з тыповых прадстаўнікоў Позняй схаластыкі – Universa philosophia, centum quaestionibus tum veterum, tum recentiorum, philosophorum placita complectens. Ён таксама вылучае тры варыянты быцця ў метафізіцы [8, с. 55]. Менавіта наяўнасць намінальнага быцця дае падставу анталагічнаму аргументу. Намінальнае быццё – гэта тое, што мы можам уяўляць, да такога тыпу быцця трэба аднесці Абсалют.

Спецыфіка анталагічнай аргументацыі прадстаўлена найбольш поўна аўтарам у чацвёртым параграфе "Ці можа існаванне бога быць прадстаўленым апрыёры" [10, с. 20–24]. Аўтар пачынае разгляд з негатыўнага варыянта адказу, спасылаючыся на Фаму Аквінскага, Суаэрса і Васкеса.

Важнай катэгорыяй, на якую абапіраецца І. Вількіновіч у разглядзе анталагічнай аргументацыі, з'яўляецца традыцыйны для схаластычнай тэалогіі і філасофіі канцэпт – aseitas, які мае карані ў лацінскім A SE – ад сябе і разглядаецца, у тым ліку і Вількіновічам [10, с. 20] як асноватворная рыса быцця Абсалюту, aseitas азначае, што ён з неабходнасцю і дастатковасцю валодае існаваннем з самога сябе і не мае ніякай іншай крыніцы існавання, у супрацьлегласць усяму астатняму створанаму быццю.

Разглядаючы магчымасць пазнання Бога апрыёры, аўтар спасылаецца на аргументацыю Дэкарта, узгадваючы яго знакаміты трохкутнік (з паняцця трохкутніка зразумела, што сума трох яго вуглоў раўна двум прамым), Вількіновіч адзначае, што існуе меркаванне, што ад вызначэння і выкарыстання самога паняцця трохкутніка не залежыць рэальнае існаванне або неіснаванне трохутніка (Пярэчанне 5) [10, с. 23], бо існаванне ў гэтым выпадку з'яўляецца толькі прэдыкатам. Узгаданы тэзіс дазваляе аформіць праблему наступным чынам: існаванне – гэта акцыдэнцыя існасці рэчы ці не? У выпадку адмоўнага адказу – анталагічная аргументацыя губляе сэнс, нягледзячы на сукупнасць дасканаласцяў, з дадзенага палажэння не вынікае неабходнасць існавання Абсалюту.

Дзеля скарэння дадзенага тэзіса І. Вількіновіч выкарыстоўвае катэгорыі абсалютнай і адноснай субсістэнцыі. Паводле логікі аўтара ў анталагічным доказе можна вылучыць дзве вялікія групы: быццё, якое не валодае неабходнасцю існавання і якому ўласціва адносная субсістэнцыя, і другая група, якая валодае неабходнасцю існавання і абсалютнай субсістэнцыяй. Падыход да існавання, уласцівы для даследавання анталагічнага статусу першай групы, немагчыма выкарыстоўваць для даследавання другой групы, у межах якой і разглядаецца існаванне Абсалюту. Рэчы, якія валодаюць абсалютнай субсістэнцыяй, з'яўляюцца неабходнымі. Толькі Бог валодае абсалютнай субсістэнцыяй, такім чынам, Бог валодае існаваннем з неабходнасці. Спосаб рэфлексіі, які ўжываецца ў адносінах да размежавання існавання паняцця і рэальнага існавання рэчы, не можа быць выкарастаны ў адносінах да суб'екта, які валодае абсалютнай субсістэнцыяй. Гэта значыць, што пытанне, ці з'яўляецца існаванне прэдыкатам існасці Абсалюту, павінна быць, згодна з пазіцыяй І. Вількіновіча, перафармулявана ў пытанне – ці магчыма пазнанне Бога? – што з'яўляецца тэмай другога Дыспута, прадстаўленай ў дадзенай працы.

**Заключэнне.** Праблема анталагічнай аргументацыі прадстаўляецца адной з асноватворных для схаластычнай рэфлексіі і застаецца актуальнай на ўсім працягу яе развіцця, яна займае важнае месца і ў беларускай філасофска-рэлігійнай думцы, у тым ліку і ў творчасці І. Вількіновіча. Філасофская рэфлексія І. Вількіновіча мае падставай як сістэмныя ўстаноўкі Ансельма Кентэрберыйскага, так і Дэкарта, не выпрабоўваючы на сябе ўплыў ідэй Ф. Суарэса, але падзяляючы погляды аўтараў, належных да напрамку позняга скацізму. Аўтар падтрымлівае ідэю існавання Абсалюту з неабходнасці, падзяляючы варыяцыю анталагічнай аргументацыі з ідэі знаходжання існавання Бога ў самім паняцці Бога. Адначасова аўтар вымушаны рэагаваць на крытыку дадзенай аргументацыі з боку аўтэнтычнага тамізму. У аргументацыі сама-відавочных суджэнняў Фамы Аквінскага вылучаюць два элементы: веды,

якія відавочны для саміх сябе, але не для нас, веды якія, відавочны для саміх сябе і для нас. І. Вількіновіч засяроджваецца на першым элеменце і, выкарыстоўваючы яго, даводзіць, што пытанне існавання з неабходнасці павінна быць перафармулявана наступным чынам: ці можа існаванне Бога быць пазнана чалавечым інтэлектам? Такім чынам, анталагічная аргументацыя праблематызуецца ў гнасеалагічным ключы і пераходзіць у іншы статус.

## ЛІТАРАТУРА


1. Кант, И. Критика чистого разума / И. Кант. – М. : Мысль. – 1994. – 592 с.
2. Кимелев, Ю.А. Философия религии: систематический очерк / Ю.А. Кимелев. – М. : Нота Бене. – 1998. – 424 с.
3. Лошиц, И.В. Онтологический аргумент в философии Нового времени / И. В. Лошиц. – М.. – 2016. – 125 с. – Режим доступа: http://vss.nlr.ru/archive_catalog.php?rid=5021. – Дата доступа: 18.08.2020.
4. Суарес, Ф. Метафизические рассуждения / Ф. Суарес. – М. : Ин-т философии, теологии и истории св. Фомы, 2007. – 776 с.
5. Шмутц, Я. Божественная наука и метафизика у Франциско Суареса / Я. Шмутц // EINAI: проблемы философии и теологии. – 2013. – № 1/2 (3/4). – С. 296–341.
6. Acta litteraria regni Poloniae et magni docatus Lithaniae. – 1755. – T. 1. – 304 p.
7. Dvořák, P. Special Issue of Baroque Scholasticism / P. Dvořák, J. Scmutz // American Catholic Philosophical Quarterly (The New Scholasticism). – 2019. – № 2. – P. 187–189.
8. Hörmanseder, A. Universa philosophia, centum quaestionibus tum veterum, tum recentiorum, philosophorum placita complectens (Ex theologia naturali) / A. Hörmanseder. – Viennae. – 1728. – 318 p.
9. Janocki, J.D. Lexicon derer iltzlebenden Gelehrten in Polen / J.D. Janocki. – Bresslau. – 1755. – 224 p.
10. Wilkinowicz, I. Tractatus theologicus de deo uno & trino : olim scholastica cura in usus discipulorum privatos elaboratus / I. Wilkinowicz. – Vilno : S. R. M. Academicis Vilnen: Soc: Jesu. – 292 p.


*Паступіў 01.10.2020*

## UNDERSTANDING OF AN ANTHOLOGICAL ARGUMENT IN THE WORKS OF I. VILKINOVICH

***A. KLIMOVICH***

*The problem of ontological argumentation is one of the foundations for scholastic reflection and remains relevant throughout its development, it occupies an important place in the Belarusian philosophical and religious thought. There is an attempt in the article to comprehend the specifics of the use of ontological argumentation in the work of the representative of "Baroque scholasticism" I. Wilkinovich in the work "Theological treatise on divine unity and trinity" (Tractatus theologicus de deo uno & trino: olim scholastica cura in ususcitos). The specifics of I. Wilkinovich's use of the categories physical and metaphysical existence of God is determined, the main point of view of I. Wilkinovich on the attributes of God's existence is considered, the position of the author in relation to the classical forms of ontological argumentation presented in the philosophical heritage of Anselm of Canterbury and Descartes is determined.*

***Keywords:*** *neo-scholasticism, ontological argumentation, self-evident judgments, metaphysical and physical existence of God, knowledge of God a priori.*